# АСЭНСАВАННЕ ВАЙНЫ ЯК АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧАЙ ТРАГЕДЫІ Ў АПОВЕСЦІ ЯНА АТЧАНАШАКА “РАМЭА, ДЖУЛЬЕТА І ЦЕМРА”

**Вострыкава А.У.**

Другая сусветная вайна для чэхаў пачалася раней, чым для іншых народаў. Трыццатага верасня 1938 г. у выніку Мюнхенскай змовы чэшскія памежныя вобласці былі далучаны да Германіі нібыта таму, што там жыве шмат немцаў і іх правы трэба абараняць. Такім чынам краіна згубіла свае натуральныя гістарычныя і геаграфічныя межы. Пятнаццатага сакавіка 1939 г. чэшскія землі былі ператвораны ў акупіраваны пратэктарат. Нацысцкая палітыка мела на мэце германізаваць чэшскія землі, выцесніць з іх чэшскі народ і знішчыць яго ў этнічных адносінах. Акупацыя выклікала супрацьдзеянне чэхаў, якое паступова перарастала ў арганізаваны рух супраціву. У руху супраціву ўдзельнічалі многія выбітныя прадстаўнікі чэшскай палітыкі, навукі і культуры і тысячы “безыменных” людзей. Пакушэнне на рэйхспратэктара Рэйнгарта Гейдрыха выклікала з нацысцкага боку рэпрэсіі, у выніку якіх загінула некалькі тысяч грамадзян. Менавіта гэтыя часы і гэтыя падзеі склалі гістарычную аснову аповесці чэшскага пісьменніка Яна Атчанашака (1924-1979) “Рамэа, Джульета і цемра” (1958).

Твор уяўляе сабой баладычную гісторыю кахання, у якой у цэнтры ўвагі адносіны чэшскага хлопца і яўрэйскай дзяўчыны ў часы нямецкай акупацыі Прагі. Аповесць пачынаецца з цытаты шэкспіраўскай “Рамэа і Джульеты”. Потым ідзе пралог, дзе чэшскі аўтар прадстаўляе нам галоўнага героя Паўла, які потым на працягу трынаццаці глаў рэтраспектыўна расказвае нам сваю гісторыю. Бацька Паўла валодае майстэрняй па пашыву адзення. Сам Павел у дзень сваіх выпускных экзаменаў выпадкова сустракае ў парку яўрэйскую дзяўчыну Эстэр, якая вырашыла не ісці на адпраўку ў концлагер Тэрэзін. Павел адважваецца дапамагчы ёй і хавае яе ў маленькім пакойчыку, які зрабіў і абсталяваў яму

бацька ў сваёй шавецкай майстэрні. Павел клапоціцца пра Эстэр, носіць ёй ежу. Праз пэўны час паміж маладымі людзьмі ўспыхвае пачуццё. Аднак іх каханне ва ўмовах нацысцкай акупацыі і пераследавання яўрэяў не можа развівацца вольна і натуральна. Яны павінны ад усіх хавацца і чакаць паразы немцаў. Павел мусіць утойваць існаванне Эстэр ад сваіх старых бацькоў і школьных таварышаў, ад бацькавых памочнікаў па майстэрні і ўвогуле ад жыхароў дома. Аднак пра Эстэр даведваецца шавец Чэпек, які стараецца выратаваць дзяўчыну пры аблаве. Тым не меньш з-за калабаранта Рэйсэка яна гіне, не дачакаўшыся, каб Павел пераправіў яе на вёску да сваёй цёткі. Часавыя межы апісанай гісторыі ствараюць падзеі, звязаныя з забойствам у Празе Гейдрыха. Павел і Эстэр знаёмяцца за дзень да гэтага. Паміраe ж Эстэр падчас нямецкай аблавы пасля смерці пратэктара.

Сам пісьменнік назвай твора, а таксама эпіграфам праводзіць паралель з шэкспіраўскай трагедыяй. Ён нібыта стварае варыяцыю даўняй гісторыі кахання ў новыя часы. Аднак у Атчанашака герояў падзяляе не варожасць іх сем’яў, а расавае адрозненне. Чэшскі творца разгортвае перад чытачом падрабязны псіхалагічны аналіз сваіх герояў, які ўвасабляецца перш за ўсё праз іх унутраныя маналогі. Таксама важнымі з’яўляюцца аўтарскія каментарыі падзей і характарыстыкі персанажаў. Так, пра сям’ю Эстэр, пра фашысцкі рэжым у Празе мы даведваемся непасрэдна ад аўтара. Часта аповед перарываецца разважаннямі саміх герояў пра іх душэўны стан, людзей і падзеі. Псіхалагічнай дамінантай аповесці становіцца туга маладых людзей па нармальнаму, свабоднаму жыццю, якое можа быць напоўнена экзістенцыяльным зместам, а не страхам пераследу і смерці. Паступова Павел і Эстэр пранікаюцца ідэяй адказнасці за другога чалавека, адзін за аднаго. Так Эстэр часта паўтарае Паўлу: “Ты павінен жыць”. Гэта становіцца прыкметай сталення маладых людзей, якія толькі выйшлі са сцен школы. Мы бачым, як паступова змяняецца настрой і погляды Паўла. З яго размоў з Эстэр пра Сусвет мы даведваемся пра яго пазітывісцка-

матэрыялістычнае ўспрыманне свету, пра яго мары даследаваць касмічную прастору, пра яго непрыняцце калабарацыянізму, а таксама яго адмаўленне бацькоўскай пазіцыі неўмяшальніцтва і жаху перад нацысцкім рэжымам. На Паўла ўплываюць гісторыі і лёсы людзей са сваёй уласнай светапогляднай пазіцый: напрыклад, хлопец пастаянна чуе выказванні майстра Чэпека, бачыць, як немцы арыштавалі мастака з іх дому за непрыняцце пануючага рэжыму. З іншага боку, Павел становіцца сведкай таго, як баіцца нацыстаў і калабарантаў яго бацька, як бяжыць у рэлігію ад жывой рэчаіснасці яго маці, якая не хоча разумець неабходнасці дапамагчы дзяўчыне, якую пераследуюць. Менавіта таму Павел адчувае сваю адзіноту. Ён пакахаў Эстэр, дзяўчыну, якая не належала да яго асяродку, яны розныя па выхаванню, палажэнню бацькоў, па сваёму жыццёваму вопыту, але абставіны і пачуцці абядналі іх, нарадзіўшы новыя памкненні і новы жыццёвы вопыт.

Трэба падкрэсліць, што аповесць чэшскага творцы адлюстравала тыя змены, што адбыліся ў паказе тэмы Другой сусветнай вайны. Калі адразу пасля 1945 г. чэшския пісьменнікі апісвалі ваенныя падзеі, то акцэнт рабіўся менавіта на гераізме, на супраціве са зброяй у руках. Проза 1950-х гг. паказвала перш за ўсё каждадзённы жах, у якім жылі звычайныя людзі, што знаходзідліся ў фашысцкай акупацыі. Так, героі аналізуемай аповесці не ўспрымаюцца намі як барацьбіты супраць фашызму, яны не здзяйсняюць нічога гераічнага, не ўдзельнічаюць у Руху Супраціўлення, што вылучала б іх сярод астатніх. Хутчэй, Атчанашак пазіцыянуе іх як ахвяр страшнага часу, якія спрабуюць выстаяць у няпросты час, праявіць чалавечую годнасць, быць вернымі свайму каханню. Яны хочуць быць шчаслівымі насуперак ваенным падзеям.

Цэнтральным вобразам-сімвалам, праз які ўвасабляецца тая атмасфера, у якой жывуць героі, становіцца вобраз цемры. Эстэр мусіць сядзець у цёмным пакойчыку з занавешанымі вокнамі, каб ніхто не здагадаўся пра яе існванне. Павел часта патаемна прабіраецца да дзяўчыны ў прыцемках,

хаваючыся ад бацькоў і знаёмых. Эстэр часта паўтарае, што ўсюды цемра, але ж павінна быць і святло. Павел і Эстэр гавораць пра тое, што яны ненавідзяць цемру і баяцца яе.

Аповесць пабудавана на ўспамінах галоўных герояў, на апісанні іх страшных снабачанняў, іх пачуццяў. Менавіта эмацыянальна-пачуццёвы складнік становіцца ў творы галоўным. "Рамэа, Джульета і цемра" мае кальцавую кампазіцыю: аповесць пачынаецца і заканчваецца разважаннямі пра тое, што старыя дамы, як і старыя людзі, поўныя ўспамінаў, у іх свой твар, сваё жыццё.

Твор быў добра вядомы за межамі Чэхаславаіі, паколькі яго пераклалі на французскую, нямецкую, італьянскую, японскую, рускую і іншыя мовы. Многія даследчыкі ставяць аповесць у кантэкст іншых літаратур. Так, беларуская даследчыца Ірына Шаблоўская зазначае: "Выпрабаванне каханнем можна, напрыклад, прасачыць на аповесці, у якой вайне супрацьпастаўлена прыгожае пачуццё, настолькі арганічнае і неабходнае для чалавека, што яно духоўна перамагае вайну, яе абсурд і пачваранасць. Перамагае, нават калі і гіне адзін з закаханых. Трагічны сюжэт пра Рамэа і Джульету прачытваецца ў творах В.Астафьева ("Пастух і пастушка"), В.Быкава ("Альпійская балада"), Я.Отчанашака ("Рамэа, Джульета і цемра"), Р.Яшыка ("Плошча святой Альжбэты") і набывае ў кантэксце літаратуры пра другую сусветную вайну адметны сэнс. Усе чатыры аповесці набліжаюцца да балады, маюць вызначальны лірычны пафас, характар сюжэтабудовы, тып героя, суадносіны паміж апавядальнасцю, споведдзю і аналітызмам. Вайна перастае быць толькі "заднікам", на фоне якога разыгрываюцца старыя, як свет, праблемы і пачуцці". [2, с.170].

Калі казаць пра чэшскую літаратуру, то трэба падкрэсліць, што у аповесці акцэнтавана тэма Халакосту, якая была для чэхаў вельмі значнай і часта станавілася прадметам адлюстравання ў мастацкіх творах пра Другую сусветную вайну. Яўрэйская тэма трактуецца Атчанашакам як тэма бязвінных пакут з-за нацыянальнай прыналежнасці. Таму твор

Атчанашака можна паставіць у кантэкст многіх раманаў А.Люсціга, які неаднойчы звяртаўся да яўрэйскай тэмы. Баладычнасць яднае “Рамэа, Джульету і цемру” з іншымі творамі памежжа 1950-1960-х гг. у чэшскай літаратуры, у якіх аўтары апісвалі акупацыю і ваенныя перыпетыі, напрыклад, з творамі Ч.Ярабэка, К.Птачніка, У.Кёрнера, Б.Грабала. Аповесць прачытваецца як лірычная проза з яскрава гуманістычнай скіраванасцю.

**Літаратура**


1. Отченашек Я. Гражданин Брих. Ромео, Джульетта и тьма / Я.Отченашек.- Москва:»Художественная литература», 1988.- 655 с.
2. Шаблоўская І.В. Сусветная літаратура ў беларускай прасторы / І.В.Шаблоўская.-Мінск:”Радыёла-плюс”, 2007.-303 с.